# Алегу Трусаву, слаўнаму сябру і настаўніку

Час - гэта найцудоўнейшы скарб, які дадзены чалавецтву, каб людзі не забываліся на духоўнае ў пошуках хлеба надзённага. Бо толькі той чалавек, які за гады назапасіў каштоўнасці мудрасці душы і розуму, можа радавацца з кожнага пражытага дня.



Так, час дае такую радасць старшыні ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алегу Трусаву, які адзначае шосты дзесятак шчасліва пражытых дзён.

Што сёння чалавецтву можа прэзентаваць гэтая слаўная, светлая асоба?

Алег Трусаў - удумлівы навукоўца, натхнёны даследнік, які здзіўляе глыбінёй, незвычайнасцю і невядомасцю фактаў. Ён першаадкрывальнік, творца ў сваім часе, які гістарычныя, археалагічныя і архітэктурныя сховы робіць даступнымі для кожнага. Вельмі далёка сягае яго дапытлівая думка, надзвычай значная сутнаснасць яго даследчыцкага і арганізатарскага розуму.

Алег Трусаў - цудоўны выкладчык, Настаўнік, які стварыў сваю адметную школу для беларускай моладзі, у якой выкладаецца найперш павага да сваёй краіны і яе гісторыі. У ягонай школе любяць вучыцца ўсе, нават самыя выбітныя асобы сучаснасці. У гэтай школе вучуся і я, і сёння маю гонар засведчыць глыбокую ўдзячнасць свайму настаўніку.

Спадар Трусаў - выбітны палітык, які прыйшоў у палітыку ў цяжкі для Беларусі час і застаўся ў ёй, каб сваёй празарлівасцю служыць Радзіме і людзям. Ён не здрадзіў палітыцы ні ў бурлівыя 90-я і не пакідае поле гэтай дзейнасці і цяпер, толькі кола ягонага чыну набыло свой планетарны абсяг.

Алег Анатольевіч - неардынарны грамадскі дзеяч, які прыходзіць у грамадскую структуру - ці гэта рэдакцыйная калегія, ці гэта арганізацыя - і сваім дзяржаўным мысленнем выводзіць яе на высокі ўзровень. Так і Таварыства беларускай мовы, спазнаўшы галечу і беднасць, сёння грунтоўна спраўджвае свае статутныя мэты, кіраванае ўладарнай рукой Гаспадара і Рупліўцы.

Старшыня ТБМ - збіральнік і захавальнік гістарычнай і моўнай спадчыны. Колькі моўных пярлінак вернута ім з гістарычных крыніц X-XX стагоддзяў у сучасную лексіку, каб прымножыць лінгвістычнае багацце планеты. Ён заўсёды і ўсюды карыстаецца роднай мовай, захаваўшы прыкметы адметнага мсціслаўскага дыялекту.

Алег - слаўны калега, сябра, які заўсёды падтрымае, дапаможа, дасць каштоўную параду. Ён верны сваім сябрам кожнага перыяду свайго жыцця - мсціслаўскага ці менскага - і за гэтую вернасць сваім прынцыпам і людзям аддзячвае яму багатымі дарамі ягоны лёс. Мне таксама шчодра вылучана луста ягонага сяброўскага таленту, якая сілкуе маё жыццё.

У Алега Анатольевіча дружная сямейка, у якой ён - любімы муж, бацька і дзед. Заснавальнік сям'і Трусавых даследуе свой знакаміты радавод, не пакінуўшы нябыту ні герб свой, ні славутыя дзеі продкаў, упэўнена капаючы рэчышча ўласнай ракі. Алег пяшчотна любіць сваю зямлю, аддаючы ёй прывітае бабуляй і прабабуляй уменне працаваць на ёй. Прыгожы дом на лецішчы атулены пекнатою і разнастайнасцю кветак (найбольш любімымі ён называе гладыёлусы. Іх у яго - мноства колераў і гатункаў), гароднiны і садавіны. І вы можаце паласавацца багатым ураджаем працавітых рук старшыні ТБМ, зайшоўшы ў сядзібу.

Гэты чалавек бачыць не толькі зямныя рэаліі, але душою размаўляе з небам, кіруючыся галоўнымі Божымі запаветамі, умеючы і любіць, і дараваць. Ён разумее, што ніколі няма той выспы, дзе ўсё гладка і правільна, бо сам таксама жыве метадам спробаў і памылак. Ён разумее вартаснасць памылак, бо сам на іх вучыцца, на сваіх і чужых. І Сусвет актыўна кантактуе з ім, ганаруючы дарамі Мудрасці, Розуму, Мужнасці, Умення, Рады, Пабожнасці. Алег Трусаў - як тая бежма, асноўная бэлька, якая трымае збудаванне разам з іншымі. І мы, сябры ТБМ, бежмаваныя яго вялікай воляй, рупнасцю і натхненнем, Атланты і Карыятыды, дапамагаем моцна трымаць гэты свет у радасці і любові.

З юбілеем, мой слаўны сябра! Ты прывабны, як вясна, гарачы душой, як лета, багаты, як залатая восень, дужы і моцны, як наша зіма. Мы - разам!

*Людміла Дзіцэвіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ